ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 25 | ПАНЯДЗЕЛАК, 30 студзеня 1933 г. | № 25

КІДАЕМ ВЫКЛІК УСЁЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВІЦЕБСКУ.

(Ліст групы камсамольцаў фабрыкі „Дзьвіна“).

Тав. Сталін у сваёй праграмнай гістарычнай прамове на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) даў разгорнутую крытыку недахопаў работы ў вёсцы і намеціў баявыя шляхі іх выпраўленьня. Тав. Сталін асабліва падкрэсьліў важнасьць узмацненьня пралетарскага і бальшавіцкага кіраўніцтва новай вёскай—савгасамі і калгасамі.

У адказ на прамову тав. Сталіна і рашэньні аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК група камсамольцаў перадавых заводаў гораду Леніна праз „Комсомольскую правду“ заявіла аб сваёй гатоўнасьці жаданьні выехаць на сталую работу ў вёску.

Рабочы калектыў віцебскага скурзаводу ў адказ на рашэньне пленуму і прамову тав. Сталіна вылучыў з свайго асяродку пяць лепшых ударнікаў, якія выказаліся добраахвотна паехаць на сталую працу ў вёску і змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае умацаваньне калгасаў.

Падтымліваючы ініцыятыву ленінградзкіх камсамольцаў і рабочых віцебскага скурзаводу, мы, камсамольцы фабрыкі „Дзьвіна“ ЯЛУКОЎСКІ, ТРАХІМІК, ШЫЁНАК, МЯДЗЬВЕДЗЕВА і ІОФЭ, увесь час прымаўшыя актыўны ўдзел у разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва на фабрыцы і ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну, заяўляем аб сваім жаданьні паехаць у вёску на сталую работу.

Праз газэту „Віцебскі пралетары“ мы зварачваемся да ўсіх камсамольцаў гораду аб вылучэньні з сваіх радоў добраахвотнікаў—лепшых ударнікаў на справу будаўніцтва калгаснай вёскі, на справу бальшавіцкай рэалізацыі баявога наказу правадыра партыі і рабочай клясы—тав. Сталіна.

Сьледуюць подпісы.

ПРАМОВА СТАРШЫНІ СНК БССР М. М. ГАЛАДЗЕДА НА III СЭСІІ ЦВК СССР.

Таварышы! Работа цяперашняй сэсіі ЦВК Саюзу супадае ў нас з выдатнымі гістарычнымі датамі —10-годзьдзем са дня ўтварэньня Вялікага Савецкага Саюзу, значэньне якога мы адзначаем на данай сэсіі, а таксама супадае з датай пераможнага завяршэньня пяцігодкі ў чатыры гады, вынікі якой падводзіць зараз уся наша краіна, а таксама працоўныя ўсіх капіталістычных краін. Абедзьве гэтыя гістарычныя даты азначаюць сабой вялікія этапы ўздыму і разьвіцьця пралетарскай рэвалюцыі на больш высокую ступень і ўплатную набліжаюць рабочую клясу і ўсе працоўныя масы нашай краіны да канчатковай ліквідацыі паразытычных клясаў і канчатковай пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Як у разрэзе вынікаў дзесяцігадовага супрацоўніцтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй, аб'яднаных у цесны брацкі саюз, так і ў разрэзе вынікаў першай пяцігодкі мы маем нязьмерна вялікія дасягненьні ў справе пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

Словы нашага правадыра, правадыра ўсяго міжнароднага пралетарыяту т. Сталіна, сказаныя ім у дакладзе пры ўтварэньні Савецкага саюзу аб тым, што стварэньне Савецкага саюзу павінна дапамагчы краіне разьвіцца ў сур'ёзную міжнародную сілу, што бяз сумненьня стварэньне Савецкага саюзу рушыць наперад справу адстанаўленьня савецкай гаспадаркі —цалкам і поўнасьцю збыліся і на ўсе 100 % апраўдаліся. Больш таго, перыяд пасьпяховага адстанаўленьня савецкай гаспадаркі ўжо далёка застаўся ззаду. Мы ня толькі адновілі разбураную гаспадарку, мы яе ўжо перабудавалі на аснове нашай высокай тэхнікі, на аснове навейшай нашай тэхнікі, на асновах сацыялізму. З аграрнай краіны наш СССР ператварыўся ў магутную індустрыяльную краіну буйнага сацыялістычнага земляробства. Дзякуючы савецкай сацыялістычнай сыстэме, кіруемай нашай партыяй, дзякуючы правільнай нацыянальнай палітыцы, якую праводзіць наша партыя і яе ЦК на чале з т. Сталіным, мы змаглі ўзьняць і ўзьнялі на службу сацыялізму, на творчую работу шматмільённыя масы ўсіх раней прыгнечаных народаў. Таму, поруч з агульным магутным ростам сацыялізму ў СССР у цэлым, аб чым з гэтай трыбуны гаварылі ўсе прамоўцы,—шпарка растуць, з кожным днём мацнеюць усе састаўныя часткі Саюзу—нацыянальныя, савецкія рэспублікі і вобласьці.

Дазвольце і мне ў падцьверджаньне таго, што гаварыў тут т. Молатаў аб росьце Саюзу ў цэлым і асобных нацыянальных адсталых у мінулым рэспублік і вобласьцяй, таксама прывесьці некалькі фактаў, якія характарызуюць сацыялістычны рост Беларускай ССР, якая на агульным фоне сацыялістычнага ўздыму расьце і мацнее і ідзе ў нагу з усім Савецкім саюзам.

Вядома, што ў дарэвалюцыйнай Беларусі ня было колькі-небудзь разьвітай фабрычна-заводзкай прамысловасьці. У сувязі з гэтым, у ёй была слабая праслойка рабочае клясы. Што мы маем зараз, да канца першай пяцігодкі, да 10-годзьдзя Саюзу ССР? У нас да канца пяцігодкі шырока разьвіліся наступныя віды прамысловасьці: мэталяапрацоўчая, прамысловасьць па вырабе будматар'ялаў, разьвіта с.-г. машынабудаўніцтва, торфапрамысловасьць, дрэваапрацоўчая, шкляная, запалкавая, хімічная і асабліва лесахімія, тэкстыльная, ільноапрацоўчая. Арганізаваны выраб штучнага валакна (пабудавана і пушчана адна з буйнейшых у Саюзе фабрыка па вырабе штучнага шоўку ў Магілёве), разьвіваецца папяровая прамысловасьць, харчова-апрацоўчая, скураная і шмат іншых відаў.

У першую пяцігодку ў нас арганізавана шмат новых відаў вытворчасьці, як, напрыклад: выраб сьвідравальных і вальцавых варштатаў і інш. відаў станкабудаўніцтва, выраб машын па здабываньні торфу, камнедрабілак і гравіясартыровак, сіласарэзак, бульбакапалак, чыгуналіцейных труб і шмат іншых відаў новых вырабаў, якіх ня ведала і аб якіх ня марыла дарэвалюцыйная Беларусь.

Мы таксама арганізавалі выраб новых будаўнічых матар'ялаў, якія так патрэбны нашаму Савецкаму саюзу, які індустрыялізуецца.

Важнейшыя вынікі прамысловага разьвіцьця Беларусі можна лёгка бачыць яшчэ на наступных фактах: выпрацоўка электраэнэргіі ў 1927—28 гаспадарчым годзе ў нас даходзіла толькі да 36 млн. кілёват-гадзін, да канца пяцігодкі ў 1932 годзе мы выпрацоўваем 210 млн. кілёват-гадзін. Торф мы здабывалі ў 1922 годзе (спачатку ўтварэньня Савецкага саюзу), усяго 23 тыс. тон, у 1927 годзе — 118 тыс. тон, а ў 1932 годзе—каля 1.000 тыс. тон, г. зн. павялічылі супроць пачатку пяцігодкі здабычу торфу ў 8—9 разоў.

Аб'ём прамысловай прадукцыі да канца пяцігодкі ў нас дайшоў да 1 млрд. руб. (дакладней 960 млн. руб.), што павялічыла вытворчасьць прамысловай прадукцыі ў 4 разы. Пяцігодку па вытворчасьці прамысловай прадукцыі мы выканалі на 103,2 проц. Капіталаўкладаньні ў прамысловасьць у нас утвораны за пяцігодзьдзе ў разьмеры 230 млн. руб., з іх больш паловы, 134 млн. руб. укладзены ў цяжкую прамысловасьць па групе «А», пяцігодка па капітальных укладаньнях у нас выканана на 102,8 проц., а па групе «А»— на 118 проц.

Таксама павялічыліся асноўныя фонды нашай прамысловасьці ў 3 разы (за тры гады), а па буйнай прамысловасьці—у 3½ разы. Удзельная вага прадпрыемстваў па колькасьці рабочых рэзка зьмяняецца ў бок павышэньня ўдзельнай вагі буйных прадпрыемстваў: напрыклад, прадпрыемстваў з колькасьцю рабочых звыш 1 тыс. у нас было да пачатку пяцігодкі ўсяго 22 проц., у 1932 годзе ў нас такіх прадпрыемстваў, якія маюць больш 1 тыс. рабочых, ужо ёсьць 43,1 проц., а прадпрыемстваў, у якіх занята звыш 3 тыс. рабочых— у нас ня было ніводнага да пачатку пяцігодкі, —зараз мы маем больш 10 проц. такіх прадпрыемстваў.

У сувязі з гэтымі агульнымі вынікамі разьвіцьця прамысловасьці рэзка павялічылася колькасьць рабочых у Беларусі: з 70 тыс. чал., якіх мы налічвалі да пачатку пяцігодкі, мы налічваем зараз да 250 тыс. чал. (разам з чыгункай). Колькасьць рабочых павялічылася больш як у 3½ разы.

Беспрацоўных у нас было да пачатку пяцігодкі 50 тыс чал., у 1930 годзе мы канчаткова беспрацоўе ліквідавалі і ўжо ў 1931 г. і ў 1932 годзе беспрацоўя ў нас няма, як і ва ўсім Савецкім саюзе.

Таварышы, вось агульныя няпоўныя, але яркія лічбы, якія паказваюць той рост, які мае Беларуская ССР у выніку пераможнага завяршэньня пяцігодкі ў чатыры гады, у выніку барацьбы за генэральную лінію партыі, у выніку правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, якая ажыцьцяўляецца нашай партыяй і Саюзным урадам.

ЯКІЯ Ж ВЫНІКІ ПА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ БЕЛАРУСІ? Я аб'яўлю некаторыя лічбы. Колькасьць калгасаў у нас вырасла ў 14,6 раза, г. зн у нас створана 8.910 калгасаў. Процант калектывізацыі сялянскіх гаспадарак вырас з 0,7 проц. у пачатку пяцігодкі да 42 проц. у 1932 годзе. Процант ахопу калгасамі пасеўных плошчаў вырас з 0,7 да 51 проц.; ахоп пасеўных плошчаў калгасамі вырас у 73 разы. Колькасьць савгасаў вырасла да 430 гаспадарак. Удзельная вага сацыялістычнага сэктару,—савгасаў і калгасаў разам,—у нас вырасла да 55 проц. да ўсёй пасеўнай плошчы з 1,9 проц., якія мы мелі да пачатку пяцігодкі. У нас арганізавана да сёньняшняга дня 57 машынатрактарных станцый. Усіх трактароў у БССР ёсьць амаль 3 тысячы, магутнасьцю больш за 30 тыс. конскіх сіл. Зараз ахоплена трактарнай цягай да 35 проц. пасеўнай плошчы. Рэзка павялічылася ўдзельная вага жывёлагадоўлі сацыялістычнага сэктару (савгасы і калгасныя фэрмы).

У былы дарэвалюцыйны час Беларусь была раёнам, над якім цягацела так званае аграрнае перанасяленьне. Зараз гэтае пытаньне ў выніку дасягненьняў па прамысловым разьвіцьці і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі зьнята, адпала канчаткова, яно ня існуе і адпала ў першых гадох пяцігодкі.

У ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ. Яшчэ ў 1926 годзе мы мелі да 50 проц. непісьменнага насельніцтва, зараз мы маем да пачатку бягучага навучальнага году—96 проц. пісьменнага насельніцтва, у горадзе да 50-гадовага ўзросту, а на вёсцы да 45-гадовага ўзросту. Што-ж да насельніцтва ва ўзросьце ад 10 да 15 год, дык тут поўных 100 проц.

У сувязі з гэтымі вялізарнейшымі дасягненьнямі мы абвясьцілі БССР рэспублікай суцэльнай пісьменнасьці. У нас моцна разьвілася сетка вышэйшай тэхнічнай і агульнай асьветы. Мы маем 30 ВНУ і ВТНУ, 27 навуковэ дасьледчых інстытутаў і станцый. 37 рабфакаў, 93 тэхнікумы, усяго ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах навучаецца 37 тыс. чал. У нас у свой час востра стаяла праблема вытворчага ўстройства яўрэйскай местачковай беднаты. Беларусь у мінулым зьяўлялася раёнам так званым (праклятай памяці царызму) «чартой аседласьці». У сувязі з гэтым мелася шмат яўрэйскай беднаты, не занятай прадукцыйнай працай. Палітычна гэта так званая «чарта аседласьці» ўшчэнт разьбіта Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Да сучаснага моманту мы ўжо зжылі, у асноўным, і эканамічныя яе вынікі.

Мы часткова гэта вырашылі шляхам спэцыяльных мерапрыемстваў па пераводзе на прадукцыйную працу местачковай яўрэйскай беднаты, праводзілі гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак. А зараз у выніку гэтай перамогі пяцігодкі, уся працаздольная бедната беларускіх мястэчак і гарадоў цалкам уцягнута ў прамысловую сельска-гаспадарчую вытворчасьць, вытворчасьць сампрамкаапэрацыі. Гэта, таварышы, зьяўляецца вялізарнейшым дасягненьнем. Мы, СССР—адзіная краіна, якая побач з агульнымі перамогамі і ў выніку гэтых перамог пасьпяхова вырашае ўсе пытаньні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Вось кароткія вынікі, якія падцьвярджаюць агульныя вывады нашага росту да канца першай пяцігодкі і да 10-годзьдзя стварэньня СССР.

Я-б хацеў падаць пару лічбаў аб тым, якжа ў капіталістычных краінах вырашаецца нацыянальная палітыка і якія яна мае вынікі. Мне хочацца сказаць вам, як жывуць працоўныя Заходняй Беларусі і працоўныя Польшчы, з якімі мы жывем па суседзтве. Калі ўзяць усю Польшчу, дык мэем наступныя характэрныя для гінучага капіталізму данныя. У галіне прамысловай вытворчасьці: выплаўка чыгуну ў Польшчы (сярэдня-месячная) у 1913 годзе раўнялася 86 тыс. тон, а ў 1932 годзе— 11.750 тон, г. зн. раўняецца ўсяго 13,7 проц. даваеннай вытворчасьці, а сярэднямесячная выплаўка сталі ў 1913 г. у іх даходзіла да 138.400, а ў 1932 г.—29.965 тон, г. зн. 26 проц. даваеннай вытворчасьці; пракатмэталю ў 1913 г раўняўся 104.300 тон, а ў 1932 г. —19.797 тон, г. зн. 22,7 проц.; у тэкстыльнай прамысловасьці Польшчы працавала да вайны 167.853 рабочых, а зараз



працуе 97.123 рабочых, скарачэньне на 70.730 рабочых. У сувязі з гэтым мы маем адпаведныя вынікі для рабочае клясы Польшчы. Я на іх спыняцца ня буду з-за таго, што мала часу. Але гэтыя вынікі вельмі сумныя. Скарачэньне зарплаты больш чымся на 20 проц., рост беспрацоўя—да 1,5 млн. чал.

Што робіцца ў прамысловасьці Заходняй Беларусі, якая знаходзіцца пад кіраўніцтвам польскай фашысцкай дзяржавы? Там мэталічная прамысловасьць цалкам спынілася. У 1932 годзе закрыты апошнія два больш-менш буйныя прадпрыемствы—ліцейны завод у Вал. кавыску і аўтамабільная майстэрня ў Вільні. У Беластоку, як вядома, была сканцэнтравана значная тэкстыльная прамысловасьць. Там у гэтым годзе закрыта 25 тэкстыльных фабрык. Ва ўсёй Беластоцкай акрузе засталіся дзьве дзеючых тэкстыльных фабрыкі. Усяго за час крызісу капіталізму з 300 прадпрыемстваў, якія былі ў Заходняй Беларусі, закрыта 142, астатнія працуюць няпоўнай нагрузкай. Адначасова з масавым закрыцьцём прадпрыемстваў будуецца хімічны завод ваеннага прызначэньня ў Гайнаўцы. Вось вам, таварышы, вынікі прамысловага «разьвіцьця» загніваючага капіталізму. У нас падвоіліся і патроіліся прамысловая вытворчасьць супроць даваеннага ўзроўню. Створаны новыя вытворчасьці, вырасьлі волаты індустрыі, роўных якім няма ў сьвеце, а ў іх поўны развал і адыход на дзесяткі год назад.

ШТО РОБІЦЦА Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ ЗАХ. БЕЛ. І ПОЛЬШЧЫ? Там мы маем жахлівыя, неапісаныя галечу, разбурэньне, пакуту. Зараз зьяўляецца паўсямесным зьявішчам, што сяляне Заходняй Беларусі—у г. Вільні і інш. гарадох,—відаюць масамі коняй на базарах з-за таго, што іх няма чым карміць. І нават іх газэты, напрыклад, пэпэсэўская газэта «Работнік» піша аб такім кур'ёзе, які вельмі паказальны для характарыстыкі становішча сельскае гаспадаркі Польшчы і Заходняй Беларусі. У адным з гарадоў Заходняй Беларусі селянін прадаў за 6 злотых каня (злоты раўняецца 22½ кап.). Аднаму грамадзяніну трэба было ехаць на аўтабусе ад гэтага гораду да другога мястэчка і трэба было заплаціць за праезд на аўтабусе 8 злотых. Ён купіў гэтага каня за 6 злотых, даехаў на месца, кінуў каня і 2 злотых на гэтай апэрацыі з'эканоміў. За тое падаткі на сялянскія гаспадаркі ў параўнаньні з даваенным часам, згодна даных іх буржуазнай прэсы, вырасьлі ў 4 разы.

Гэта гаворыць аб тым, што сяляне Заходняй Беларусі і іншых капіталістычных краін, як і ўся рабочая кляса гэтых краін, даведзены да нябачанай галечы, да суцэльнага разбурэньня і голаду. Вось вам вынікі нацыянальнай палітыкі буржуазіі і фашызму ў адрозьненьне ад вынікаў, якія мы маем тут, у нашым вялікім сацыялістычным Саюзе.

Перад тым. каб скончыць сваю прамову, я павінен сказаць аб тым, ЯК МЫ Ў БЕЛАРУСІ СПРАВІЛІСЯ З АСНОЎНЫМІ ПАЛІТЫЧНА-ГАСПАДАРЧЫМІ КАМПАНІЯМІ БЯГУЧАГА ГОДУ. Трэба сказаць, што ў галіне сельска гаспадарчых загатовак мы ў пачатку кампаній мелі цэлы рад памылак, моцна адставалі. Недахопы, аб якіх сказана ў гістарычнай прамове т. СТАЛІНА па рабоце на вёсцы, мелі месца і ў нас. Указаньні аб іх далкам і поўнасьцю адносяцца і да нашай работы. Яны, гэтыя недахопы і памылкі зьявіліся галоўнай прычынай нашага першапачатковага адставаньня, бязумоўна гэтае адставаньне ў пачатку збожжазагатоўчай кампаніі сьведчыць аб слабасьці нашай работы на вёсцы. Потым ЦК УсеКП(б) паправіў нас, заслухаўшы даклад аб нашай рабоце ў галіне сельска-гаспадарчых загатовак, указаў нам у сваёй пастанове на палітычныя і практычныя памылкі. Мы на падставе гэтых указаньняў з боку ЦК мабілізавалі партыйныя і савецкія арганізацыі, перабудавалі работу і падцягнулі фронт загатовак. 1 студзеня (датэрмінова) выканалі збожжазагатоўчы плян на 102,5 проц., а на сёньняшні дзень мы выканалі плян збожжазагатовак на 111 проц. Бульбазагатоўкі, якія становяць у нас вялікую лічбу, мы таксама выканалі поўнасьцю і ў тэрмін (20 студзеня) і зараз ідзем па шляху іх перавыкананьня. Мясазагатоўкі мы выканалі на 130 проц. (квартальны плян). Выкананьне пляну ільнозагатовак у нас набліжаецца да канца. Астатнія віды загатовак таксама скончаны ва ўстаноўленыя тэрміны.

Тая акалічнасьць, што адставалі ў пачатку загатоўчай кампаніі да таго часу, пакуль ЦК УсеКП(б) не ўказаў на нашы памылкі, гаворыць аб тым, што ў нас, у БССР, мае месца ў рабоце цэлы рад сур'ёзных недахопаў. Мы ўлічылі ўказаньні ЦК і СНК СССР, зрабілі патрэбныя вывады і зараз гэты фронт падцягнулі.

Я хачу сказаць яшчэ аб наступным: тав. СТАЛІН у сваім дакладзе на пленуме ЦК і ЦКК сказаў: трэба мець на ўвазе, што рост магутнасьці савецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленьне апошніх рэштак адміраючых клясаў... і што могуць ажыць і заварушыцца разьбітыя групы старых контрэвалюцыйных партый—эсэраў і меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў цэнтру і ўскраін. Гэтае папярэджаньне тав. Сталіна асабліва своечасова, правільна і неабходна таму, што побач з агульным абвастрэньнем клясавай барацьбы ў нас, напрыклад, у БССР, мае месца ажыўленьне нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, беларускага нацыяналізму. Нягледзячы на гіганцкія дасягненьні ў галіне сацыялістычнай перабудовы нашай ўсёй эканомікі і гіганцкага ўздыму культуры, які мы маем у нас, знаходзяцца яшчэ такія людзі (я павінен аб гэтым сказаць на сэсіі ЦВК Саюзу ССР), якія выказваюць нездаволенасьць, бурчань, часта ныюць і яўна шкодзяць справе рабочых і сялян, яны не ад таго каб рабіць кіўкі ў бок Савецкага саюзу, прэтэнзіі, што нібы Савецкі саюз мала дапамагае разьвіцьцю Беларусі. Гэта ёсьць буржуазна-нацыяналістычныя элемэнты, якія яўна адбіваюць азлобленасьць і безнадзейнасьць гінучых капіталістычных клясаў і ліквідуемага кулацтва. Ясна, што яны, гэтыя нацыяналістычныя элемэнты, зьяўляюцца прадстаўнікамі агентуры разьбітага, гінучага кулацтва і зарубежнага фашызму. Ясна, што яны прыклалі сваю руку да арганізацыі сабатажу сельска-гаспадарчых загатовак, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам. Рабочая кляса і калгаснае сялянства БССР, пад кіраўніцтвам нашай партыі, даюць рашучы адпор такім контрэвалюцыйным нацыяналістычным элемэнтам, гэтым рэшткам разьбітага, але яшчэ недабітага нацыяналізму. Рабочая кляса і сялянства разумеюць, што дзякуючы вялікай штодзённай сыстэматычнай дапамозе, якую аказвае Савецкі саюз у справе гаспадарчай і культурнай перабудовы Беларусі па шляху сацыялізму, як і іншым адсталым у мінулым нацыянальным рэспублікам, толькі дзякуючы гэтаму мы вышлі на шырокі шлях сацыялістычнага ператварэньня і ідзем у нагу з усім Савецкім саюзам, разумеючы, што дасягнутыя посьпехі зьявіліся непасрэдным вынікам сыстэматычнай дапамогі працоўных усяго СССР. Мы і надалей будзем даваць рашучы адпор такім спробам злосных нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, якія выконваюць сацыяльны заказ польскага фашызму і гінучага беларускага кулацтва.

Таварышы, я не магу ў сувязі з канцом рэгляменту падрабязна спыніцца на задачах 1933 году, а гэтыя задачы зьяўляюцца сапраўды гіганцкімі. Усё тое, што сказаў тав. МОЛАТАЎ у свім дакладзе, нам трэба на практыцы ажыцьцявіць, а ажыцьцявіць мы здолеем гэта, калі сапраўды, як ужо многія таварышы гаварылі тут, узмоцнім клясавую пільнасьць, разгорнем далейшую барацьбу з рэшткамі варожых клясаў і іх агентурай—апартуністычнымі элемэнтамі, перш за ўсё, з правымі апартуністамі, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і калі мы ўстановім у нашым савецкім апараце сапраўды жалезную дысцыпліну, калі мы ўстановім і будзем цьвёрда праводзіць найстражэйшую планавую дысцыпліну і моцна змагацца з усялякімі месьніцкімі інтарэсамі, а яны ёсьць ня толькі ў Маскоўскай вобласьці, як аб гэтым гаварыў тав. Камінскі ў сваёй прамове, а і ў нас, у Беларусі, так і ў іншых рэспубліках і вобласьцях і ў немалой меры. Ясна, што такія тэндэнцыі шкодзяць справе і падрываюць нашы агульныя посьпехі. Усё гэта неабходныя ўмовы, каб выканаць тыя вялізарныя і вялікія задачы, якія былі ўказаны тав. МОЛАТАВЫМ у яго дакладзе, і якія абазначаюць далейшае разгорнутае наступленьне па ўсім фронце.

Таварышы, рабочая кляса накапіла вопыт барацьбы за першую пяцігодку. Гэты вопыт гаворыць нам аб тым, што мы ўмеем ня толькі прымаць пляны, але і выконваць іх з вялікім посьпехам. Таму план 1933 году будзе выкананы і перавыкананы. Тав. СТАЛІН сказаў, што наша партыя непераможна, калі яна ведае куды весьці справу і не баіцца труднасьцяй. Наша-ж партыя правільна вядзе справу і перамагае ўсе труднасьці—таму што нашу партыю, усю рабочую клясу і калгаснае сялянства вядзе па правільным ленінскім шляху наш вялікі правадыр сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі тав. СТАЛІН, пад выпрабаваным кіраўніцтвам якога мы перамагалі дагэтуль, пад яго кіраўніцтвам мы пераможам і ў другой пяцігодцы—пяцігодцы пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. (АПЛЁДЫСМЭНТЫ).

Прылівам у калгасы адказваюць працоўныя аднаасобнікі на рашэньні аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК.

В.-Лётчанскі сельсавет. (Па тэлефону ад нашага спэцкора). 26 студзеня адбыўся пленум В.-Лётчанскага сельсавету. Пленум аднагалосна ўхваліў гістарычныя пастановы студзеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і падкрэсьліў своечасовасьць і вялізарнае палітычнае значэньне новага закону аб хлебазагатоўках на 1933 год.

Пленум абвясьціў трохдзённік штурму па ліквідацыі прарыву па загатоўцы бульбы і засыпцы страхавых фондаў па аднаасобнаму сэктару. Мабілізаваны ўвесь актыў, члены сельсавету, настаўніцтва, брыгадзіры. Першы дзень штурму адзначыўся зрухам наперад. Адстаючая вёска Мазанава засыпала страхфонд на 70 проц.

У адказ на пастановы пленуму і выступленьне т. Сталіна «аб рабоце ў вёсцы» 6 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі Трубачы падалі заявы аб прыёме іх у калгас. Асаблівы прыліў ідзе ў калгасе «Культфронт». Падана 53 заявы, з якіх прынята 31. Вёска Абраменкі цалкам падала заяву аб уступленьні ў калгас. У калгасім «Віцебскага пралетарыя» падана 15 заяў, у калгас «Пабеда»—6 заяў.

Брыгадзір „В. П.“ Раскін.

Аб рабочым шэфстве над МТС завком „Чырвонага мэталіста“ запамятаў.

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб удзеле прафарганізацый у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы была вынесена больш дэкады назад.

Згодна гэтай пастановы, мэталюргічныя прадпрыемствы Беларусі прымацоўваюцца да асобных МТС і МТМ для практычнай дапамогі ім у рамонце трактароў. Так, да Дрысенскай МТС прымацавана голкавая фабрыка, да Расонскай—акулярная, да Лепельскай МТМ—завод «Камінтэрн» і да Гарадоцкай МТМ—завод «Чырвоны мэталіст».

Аб важнасьці своечасовага рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару ў пасьпяховым правядзеньні веснавой сяўбы вельмі добра ведаюць ФЗМК гэтых прадпрыемстваў. Здаецца, што яны зараз-жа павінны былі мабілізаваць для работы МТС лепшых ударнікаў-рабочых, якія маглі б ня толькі адрамантаваць трактар, але і дапамагчы наогул станцыі, наладзіць цесную і жывую сувязь МТС з шэфствуючым прадпрыемствам.

На справе гэтага няма. Завком «Чырвонага мэталіста» гэтым пытаньнем ня толькі не займаўся, але нават і ня ведаў аб пастанове ЦСПСБ. Толькі 26 студзеня, калі старшыні завкому т. Мацьвееву сказалі аб тым, што завод прымацаваны да Гарадоцкай МТМ—пытаньне аб пасылцы брыгад было пастаўлена на паседжаньні завкому. „Абгаварваць кандыдатуры рабочых на цэхавых сходах завком ня будзе“, ніякай масавай работы вакол гэтага ён не праводзіць, у выніку рабочае шэфства зноўтакі зводзіцца да фармальнай пасылкі рамонтных брыгад і матар'ялаў.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове папярэджвала, што трэба рашуча змагацца „з малейшымі спробамі ператварыць вытворча-тэхнічнае шэфства ў звычайнае бюракратычнае вылучэньне брыгад для пасылкі ў МТМ і МТС“, але і гэтыя паказаньні Цэнтральнага камітэту партыі пад увагу прафарганізацыяй „Чырвонага мэталіста“ ня прыняты.

На заводзе „Камінтэрн“ пытаньне аб наладжваньні вытворча-тэхнічнага шэфства і пасылкі брыгад разьбіралася на адчыненым партыйным сходзе, на паседжаньні завадзкога камітэту і зараз выносіцца на абгаварэньне агульнага сходу. Але ўсё-ж такі і там работа пачата позна, упушчана больш 10 дзён.

Больш так працягвацца не павінна. Нельга абмяжоўвацца фармальнай пасылкай людзей. Прафарганізацыі мэталюргічных прадпрыемстваў Віцебску абавязаны ўзьняць пытаньне рабочага шэфства на МТС на належную вышыню з тым, каб сапраўды дапамагчы МТС ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях. Толькі пры ўмове шырокай масавай работы вакол гэтага важнейшага пытаньня, рабочае шэфства будзе бальшавіцка дзейсным.

Брыгадзір „В. П.“ Н. Салаўёва.

ПЛЕНУМ гарКК, ПРЫЗНАЧАНЫ НА 1 ЛЮТАГА, ПЕРАНОСІЦЦА.

АБ ДНІ СКЛІКАНЬНЯ БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЁНА АСОБНА.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ФЗМК.

НАКАЗ — ПАЛІТЫЧНЫ ДАКУМАНТ

НА „ЧЫРВОНЫМ МЭТАЛІСЬЦЕ“ ГЭТАГА НЕ ЗРАЗУМЕЛІ.

Шуміхай і фармалізмам падмянілі баявую работу.

Завод „Чырвоны мэталіст“—адзін з першых распачаў падрыхтоўку да справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК і ўжо завяршыў яе перавыбарам загадзкога і цехавых камітэтаў.

Як-жа арганізацыі заводу правялі гэту адказную палітычную кампанію?

Дамо слова тром фактам.

1) Завком „рашыў“ правесьці гэтую кампанію масава, мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ён зрабіў выклік на лепшае правядзеньне кампаніі фабрыкам „Сьцяг індустрыялізацыі“, акулярнай і „Дзьвіне“. Аднак, на справе ня толькі не адчувалася спаборніцтва, але нават ня былі заключаны сацдагаворы. І так, канкрэтная баявая падрыхтоўка была заменена шуміхай.

2) На справаздачна-перавыбарчым сходзе ў кожным цэху (у адзін вечар) разглядваліся наступныя пытаньні: а) справаздача завкому, б) справаздача цэхкому, в) справаздача камітэту ўзаемадапамогі і г) справаздача страхбюро. Такім чынам, на сходзе гаварылі аб усім панямногу. Канкрэтна ж у масавым парадку ня было вырашана ні адно пытаньне.

3) 27-га студзеня праводзіліся выбары новага складу завкому і зацьверджаньне наказу. У кожным пункце наказу можна ясна бачыць словы: „прапанаваць“, „разгарнуць“, „узмацніць“, „паставіць“, „кіраваць“... па сутнасьці-ж у наказе ня толькі адсутнічаюць прапановы рабочых новаму складу завкому, але няма ніводнага канкрэтнага пункту. Больш таго, наказ складзен палітычна-няпісьменным. У ім ні слова аб апошніх гістарычных рашэньнях аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), аб праграмнай прамове т. Сталіна, аб задачах прафарганізацыі заводу і аб іх удзеле ў барацьбе за ўзьняцьцё прадукцыйнасьці працы, зьніжэньні сабекошту, паленшаньні якасьці прадукцыі. Складаў і афармляў наказ старшыня завкому Мацьвеяў пры ўдзеле прадстаўніка ЦК саюзу т. Ітэльмана.

Вывад. Вурокі прафарганізацыі „Чырвонага мэталіста“ вучаць як ня трэба ладзіць справаздачна-перавыбарчую кампанію ФЗМК.

Арганізацыі заводу, у тым ліку і партыйны калектыў, недаацанілі палітычную важнасьць справаздачна-перавыбарчай кампаніі прафзьвеньняў, не кіравалі ходам падрыхтоўкі і правядзеньнем выбараў, не скарысталі кампанію для мабілізацыі мас на рашучую барацьбу за рэалізацыю гістарычных рашэньняў студзеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК. Адсюль і зразумела, чаму былі дапушчаны буйныя палітычныя памылкі.

Брыгада „Віцебскага пралетара“: Б. Зэліксон. С. Багары.

Правяраем работу ФЗМК.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ФЗМК на лесазводзе № 3 праходзіць пад знакам мабілізацыі мас на выкананьне прамфінпляну і палепшаньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых. У цэхох праводзяцца сходы і гутаркі з рабочымі аб значэньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Створаны самаправерачныя брыгады, у якіх актыўны ўдзел прымаюць ударнікі і рабкоры па абсьледваньні работы завкому.

Лібенштэйн.

Забыты гарпрафсаветам вучастак работы.

У другой пяцігодцы—пяцігодцы пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, перад прафсаюзамі, як школай камунізму, стаяць вялізарныя задачы ў галіне палітычна-выхаваўчай работы працоўных мас у марксыцка-ленінскім духу.

Прафсаюзы ў сваёй штодзённай рабоце павінны зьяўляцца сапраўды «прывадным рэмнем ад партыі да мас». Другая пяцігодка ставіць задачай перад прафсаюзамі падрыхтаваць пралетарыят да бясклясавага грамадзтва.

З гэтае прычыны на грані другой пяцігодкі прафарганізацыя ва ўсёй сваёй сыстэме павінна асаблівую ўвагу ўдзяліць падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы прафкадраў, узяўшы ў прынцып працы форму вучобы без адрыву ад вытворчасьці. Віцебскі ГПС зусім мала зьвяртае ўвагі на гэты вялізарнейшы вучастак работы, пастаўлены 16-м зьездам партыі і 9-м зьездам прафсаюзаў.

Прафучоба па гор. Віцебску пушчана на самацёк. Маецца ў ГПС прафпрапагандыст т. Гарфункель. Гэты таварыш займаецца ўсялякімі пытаньнямі, але толькі не прафкадрамі.

Культадзел і ў цэлым прэзыдыум ГПС не правяралі работу прафпрапагандыста, не дапамагалі яму, а наадварот, нагружалі ўсялякімі пабочнымі пытаньнямі (рабочым забесьпячэньнем, скліканьнем і правядзеньнем канфэрэнцыі і г. д.).

У асноўным можна сказаць, што прафучоба—закінуты вучастак прафработы па гор. Віцебску, нягледзячы на тое, што для яе масавага разгортваньня маюцца ўсе ўмовы. Ёсьць пробліскі прафучобы, але гэта прафучоба ідзе самацёкам і дае малыя рэзультаты. Распачата прафучоба на акулярнай фабрыцы, «Прафінтэрне», лесазводзе № 3 і групкомам грамадзкага харчаваньня. Гіганты-ж беларускай прамысловасьці ні адзін не распачаў гэтай работы. На некаторых з іх, як фабрыка «Дзьвіна», імя Клары Цэткін і яшчэ некалькіх, праўда, ёсьць намёткі, каб распачаць работу праз месяц альбо больш, але намёткі гэтыя вельмі разнашорсныя, што сьведчыць аб адсутнасьці кіраўніцтва. Лепшымі паказчыкамі могуць служыць лічбы: з 60 прадпрыемстваў гор. Віцебску распачалі прафучобу толькі 4 прадпрыемствы, астатнія альбо адгаварваюцца і старэюцца даказаць, што ў іх нешта калісьці будзе, альбо адкравенна прызнаюцца, што «гэтым пытаньнем не займаліся, не хапае часу на кадры».

Віцебскаму гарпрафсавету неабходна зьвярнуць на гэты вучастак асаблівую ўвагу, пераключыцца на практычную дапамогу прадпрыемствам, бо на радзе прадпрыемстваў культмасавыя працаўнікі новыя, толькі ў гэтым годзе скончыўшыя школу прафруху.

Мабілізаваць культактыў і гэтым стварыць моцную групу навокал культаддзелу ГПС і рушыць яго штурмам за прафучобу, бо з гэтым пытаньнем Віцебск запаздаў і неабходна ў самы бліжэйшы час навярстаць прапушчанае.

Гудайціс.

„Цяпер задача заключаецца ў тым, каб умацаваць калгасы арганізацыйна, вышыбіць адтуль шкодніцкія элемэнты, падабраць сапраўдныя праверараныя бальшавіцкія кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі. У гэтым цяпер галоўнае“. *(СТАЛІН).*

КІРУЮЧЫЯ ПАСТЫ—У РУКАХ КУЛАКОЎ.

Кіраўніцтва калгасу імя Калініна, Машканскага сельсавету, засьмечана варожымі элемэнтамі.

Старшыня калгасу Лядзенка Піліп да ўступленьня ў калгас быў цьвёрдазаданьнікам, перад уступленьнем у калгас «падзяліўся» з бацькай, а на самай справе жывуць сумесна, маюць 2 каровы і каля 100 дрэў саду. Ён нейкім чынам прадез у партыю.

Лядзенка ўвесь час займаецца самаснабжэньнем, атрымоўваючы муку з розных брыгад, аб чым сьведчаць яго расьпіскі ў амбаршчыкаў, пры раздачы парасят сабе ўзяў 4 парасёнкі, а некаторым калгасьнікам ня даў ніводнага.

Скарбнік калгасу Губарэвіч Кастусь—былы заможнік. На работу гэты скарбнік прыходзіць а 11—12 гадзіне. Значную частку свайго рабочага часу прасіджвае ў краме.

Брыгадзір Грышанаў Рыгор—былы цьвёрдазаданьнік. Займаецца кражай калгаснага хлеба, спэкулюе маслам, адвозячы яго ў Ленінград. Бацька гэтага брыгадзіра—кулак. Пры вобыску ў яго знойдзена 8 клгр. мыла, шмат мануфактуры і іншых рэчаў. Гэты кулак калгасьніцы Грышанавай Ганне кажа: «Ты ўвесь свой век будзеш мне служыць як прыгон».

Брыгадзір Машэра Мікіта—былы заможнік, знайшоў для сябе апорай кулака Ляхоўскага і спэкулянта Шарыба (апошняга прызначыў амбаршчыкам). Гэтыя былыя людзі вядуць разлагаючую работу ў брыгадзе. Да рэчы сказаць, Машэра за злачынства ўжо арыштаваны.

Брыгадзір Когаль Янка—былы спэкулянт конямі, за што быў пазбаўлены права голасу, а зараз залез у калгас, разлагае брыгаду, займаецца крадзяжом хлеба.

Гэтае кулаччо ўпарта вядзе сваю работу амаль-што па ўсіх брыгадах калгасу, накіраваную на зрыў мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчаму яго ўмацаваньню, супроць выкананьня абавязкаў калгасам перад пралетарскай дзяржавай. Кулацкую зграю неабходна як мага хутчэй ізаляваць. Даць калгасу сапраўды бальшавіцкія кадры, якія-б здолелі зрабіць калгас бальшавіцкім.

А.

НЕ ПРАЎЛЕНЬНЕ, А КУЛАЦКАЯ ЗГРАЯ.

Не выпадкова калгас «Барэц», Мікалаеўскага сельсавету, мае вялікія прарывы па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасу, бо кіруючая галоўка калгасу засьмечана кулацкімі элемэнтамі.

Член праўленьня Чапкоўская Юзэфа — дачка кулака, які меў 25 га зямлі, 1,5 га лесу, 5 кароў, 2 кані і стада дробнай жывёлы. Член праўленьня Васільлеў Мікола да ўступленьня ў калгас меў 20 га зямлі, 2 га лесу, 5 кароў, 2 кані. Член праўленьня Анухаў—сын былога кулака, які меў 30 га зямлі, 2 га лесу, 2 кані, 6 кароў.

Старшыня калгасу Савельлеў В. фактычна выконвае заданьне гэтай кулацкай зграі. Ён прывёў пункт Валконка да глыбокага прарыву ў хлебазагатоўках, займаецца очкаўцірацельствам, заціскае самакрытыку.

Кулацка-заможная частцы ў калгасе даецца сталая работа, а беднаце падбіраецца горшая работа. Напрыклад, былыя кулакі Лебедзеў Т. і Лебедзеў М., меўшыя па 34 га зямлі, па 8 кароў, па 2 кані і па некалькі дзесяткаў дробнай жывёлы, увесь час стала работаюць на МТФ. А калі былы бядняк Васілеўскі І. пайрасіў, каб яму далі сталую работу, то член праўленьня Анухаў вуснамі кулака адказаў: „Ты бядняк—ты дурак. Ты ня сумееш саадпавядаць гатаму гасту“.

Рахункаводу сыну кулака Лебедзеву за прарыў у канцалярыі, які, галоўным чынам, заключаўся ў няправільным запісе працадзён (што прывяло да масавага нявыхаду калгасьнікаў на работу) праўленьне зьняло толькі 15 працадзён, а былому бедняку Васілеўскаму Д. за тры дні прагулу гэта кулацкае праўленьне зьняло 75 працадзён.

Такое кіраўніцтва надалей ня можа кіраваць калгасам, бо ўся яго работа накіравана на развал калгасу, а не на яго ўмацаваньне. Праўленьне неадкладна павінна быць пераабрана.

К.

ЗА ВАРАШЫЛАЎСКІ ЎКЛАД У АШЧАДКАСУ.

Варашылаўскай фінансавай эстафэце—штодзённае партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва.

ПРАВЕСЬЦІ АДЗІНЫ САВЕЦКІ ДЗЕНЬ, ПРЫСЬВЕЧАНЫ ХОДУ ВЫКАНАНЬНЯ ФІНПЛЯНУ. (Шчаткомб).

Рабочыя шчаткомбу адабраюць ініцыятыву 5-й істужкі імя Парыскай камуны фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі». У адказ на іх выклік рабочыя двух цэхаў (падрыхтоўкі кадраў і хедрэваапрацовачны) усе як адзін уступілі членамі ашчаднай касы.

Камсамольскі калектыў шчаткомбу ў сувязі з варашылаўскай фінансавай эстафэтай расстаўвіў сілы па цэхах для вядзеньня масавай работы.

Шчаткомбаўцы хадайнічаюць перад гарсаветам, гарпрафсаветам аб правядзеньні адзінага масавецкага дню па ўсіх прадпрыемствах і ўстановах па пытаньню аб становішчы выкананьня фінансавага пляну першага кварталу і абслугоўваньня пазыкатрымацеляй.

Лысенка.

ЗЛОСНЫЯ НЕДАЛАЦЕЛЬШЧЫКІ НА ПАЗЫЦЫ „4, ЗАВЯРШАЛЬНЫ“.

Белэнэрга ня ўнёс яшчэ ў Дзяржбанк 1000 р.; цэнтральная гасьцініца—690 руб.; млын № 1 — 1337 руб; каапгас «Церасполь»—747 р.; савгас «Падбярэзьзе»—819 руб; тэкстыльны тэхнікум—688 руб.; буфэт і сталоўка пры 1-й Полясе вагзалу—706 руб.; плодатрэст—1826 р.; групком будаўнікоў № 22—4000 руб; савет саматужнікаў—2500 руб; дом дзіцяці—900 р.; Белдзяржтэатр—600 руб; гартэатр—600 руб.

Гэтыя арганізацыі і ўстановы злачынна затрымліваюць дзяржаўныя сродкі.

Пракуратура за парушэньне фінансавай дысцыпліны павінна неадкладна вінаватых прыцягнуць да судовай адказнасьці.

РАБОЧЫЯ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ, АДКАЗВАЙЦЕ НА ВЫКЛІК ПРАФІНТЭРНАЎЦАЎ.

Рабочыя фабрыкі «Прафінтэрн» на 28 студзеня ўклалі ў ашчадкасу 9000 рублёў. Па ўсіх цэхах разгорнута масавая работа. Кожны рабочы з вялікім здавальненьнем адказвае на высунутае мерапрыемства 5-й істужкай імя Парыскай камуны фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі».

Прафінтэрнаўцы яшчэ раз зварачваюцца да рабочых фабрыкі імя Лекерта аб падтрыманьні ініцыятывы 5-й істужкі і аб адказе практычнымі справамі на іх выклік.

Бабіцкі.

ПАДТРЫМЛІВАЕМ ПАЧЫН 5-ай ІСТУЖКІ.

27-га студзеня адбыўся агульны сход работнікаў ашчадкас гораду па пытаньні варашылаўскай фінансавай эстафэты. Работнікі ў колькасьці 65 чалавек падтрымліваюць ініцыятыву 5-й істужкі і ўносяць у ашчадную касу 1350 руб.

Усе работнікі ашчадкасы расстаўлены па прадпрыемствах для дапамогі апошнім у правядзеньні варашылаўскай фінансавай эстафэты. Выклікаюць пасьледваць іх прыкладу работнікаў Дзяржбанку, камунбанку, гарФА і пошты.

Сокалаў, Ствалінскі.

УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ВАРАШЫЛАЎСКУЮ ФІНЭСТАФЭТУ.

Рабочыя, вучні і служачыя швэйнай майстэрні школы таварыства «Прыхільнікі дзяцей», заслухаўшы інфармацыю аб варашылаўскай фінансавай эстафэце, уключыліся ў гэта мерапрыемства. Тут-жа на сходзе было сабрана ўкладаў у ашчадкасу на суму 500 р. Лепшымі ўдарнікамі зьяўляюцца: т. Пінскер, які паклаў на ашчадную кніжку 75 р., Дунаеў—75 р., Розін—30 р., Каган—30 р., Эскіна—30 руб. Рудкіна, Цыўпнаў—па 30 р. Вучні Баркан і Будзякін—па 15 р., Піпкін—10 р.

Эскіна.

СЛОВА ЗА РАБОЧЫМІ ФАБРЫКІ ІМЯ КІМ.

Рабочыя фабрыкі імя Клары Цэткін падтрымліваюць ініцыятыву 5-й істужкі імя Парыскай камуны фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі». Ужо ўкладзена 3000 рублёў. Рабочыя фабрыкі імя Клары Цэткін выклікаюць пасьледваць іх прыкладу рабочых фабрыкі імя КІМ.

Ствалінскі.

БЕЗАДКЛАДНА РАЗДАЦЬ ПАДПІСЧЫКАМ ЗАМАЦАВАЛЬНЫЯ ТАЛЁНЫ.

Днямі мы зьмяшчалі матар'ял удзельнікаў рэйду па правэрцы раздачы замацавальных талёнаў пазыкі «4-ы, завяршальны» падпісчыкам.

ГарКК за праяўленую злачынную нядбайнасьць да абслугоўваньня пазыкатрымацеляў абвясьціла суровую вымову касірам: Салаўёву („Прагрэс“), Карлецкаму (хлебазавод), Баркоўскаму, (дзяржпараходства) і бухгальтэру базы Белутыля Сьцепаньку і папярэдзіла іх, што ў выпадку нераздачы замацавальных талёнаў на працягу 3-х дзён справа аб іх будзе перадана суду.

Абвешчана суровая вымова старшыні і сэкратару Бараўлянскага сел. за дапушчаную цягаціну з прадстаўленьнем сьпісаў на замацаваньне падпіскі калгасьнікаў на пазыку, і прапанавана ў пяцідзённы тэрмін раздаць замацавальныя талёны калгасьнікам-падпісчыкам.

ГарКК прапанавала ўсім кіраўнікам прадпрыемстваў і гаспубухам устанавіць сталы нагляд за свае часовай раздачай падпісчыкам замацавальных талёнаў і аблігацый. З асаблівай настойлівасьцю ВіцгарКК патрабуе ад усіх партколектываў, ФЗМК, камсамолу і камсодаў разгортваньня масавай работы па ахопе рабочых падпіскай на пазыку з тым, каб да першага тыражу на засталося-б ніводнага рабочага, служачага, калгасьніка—не падпісаўшагася на пазыку.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ АДЗІНАГА КАМСАМОЛЬСКАГА ПАЛІТДНЮ 1-га ЛЮТАГА 1933 ГОДУ.

Пастанова гаркому КП(б)Б.

Абавязаць усе калектывы і ячэйкі КП(б)Б прамысловых прадпрыемстваў аказаць дапамогу камсамольскім ячэйкам у правядзеньні адзінага камсамольскага дню 1-га лютага, абгаварыўшы практычныя мерапрыемствы на паседжаньнях партбюро.

Забараніць скліканьне якіх-бы та ні было нарад, сходаў і пасяджэньняў у дзень 1-га лютага. Парткалектывам і ячэйкам забясьпечыць удзел камуністаў, асабліва кіруючага партактыву і адмтэхперсаналу на камсамольскім сходзе.

У дапамогу ГК КСМ мабілізаваць наступных т.т.: Ханіна (імя Кл. Цэткін), Крэйман (фабрыка імя Лекерта), Галанцаў, Каган (ГК КП(б)Б), Плаўнік («Дзьвіна»), Эдэльштэйн (імя КІМ), Ванчук (Вадаканал) для папярэдняй падрыхтоўчай работы да камсамольскага дню і правядзеньня дакладаў на сходах.

Гарком КП(б)Б падкрэсьлівае асаблівую важнасьць падрыхтоўкі да адзінага камсамольскага палітдню, правядзеньня яго і падвядзеньне вынікаў у напрамку практычных мерапрыемстваў, накіраваных на ўзмацненьне ролі моладзі ў выкананьні прамфінпляну.

11-га лютага на паседжаньні гаркому КП(б)Б заслухаць даклад аб выніках правядзеньня камсамольскага дню.

Сьпіс дакладчыкаў па правядзеньні адзінага камсамольскага дню.

Саравайскі (прымацаван да «Сьцягу індустрыялізацыі»). Ханіна (Клары Цэткін). Крэйман (шчаткомбу), Каган (Лекерта), Плаўнік («Дзьвіны») Эйдэльштэйн („КІМ“), Фрыдман (акулярная), Юрынсон («Прафінтэрн»). Бачанава (голаваў), Галанцоў (лесазводу імя Правды»), Грушын («Чырвонага мэталіста»), Жалязьняк (гарсавету), Гендзель (махорачная), Грыдзюшка («Прагрэс»), Іофе (фанярнага заводу), Сакалова (акурзаводу), Брэгман (ложкавей), Гевін (маслазаводу), Грынман (друкарні „Камінтэрн“), Лепяшынскі (піўзаводу). Ванчук (утыльбазе), Масарскі (Каапрамохту).

Змагаючыся за колькасьць, асаблівую ўвагу—якасьці работы.

САМЫ ДАКЛАДНЫ І ШТОДЗЁННЫ ВУЧОТ ЯКАСНЫМ ПАКАЗЧЫКАМ.

СКУРА.

За 27 студзеня па скурзаводзе выпушчана 3613 кілёграм гатовага тавару, што складае 120 проц. пляну. У цэнасным выражэньні па чырвонадубнаму цэху плян выкананы на 118,8 проц. Усяго па заводзе плян выкаваны на 114 проц. Гатунковасьць прадукцыі—98,2 проц.

За 28 студзеня выпушчана 3206 кілёграм гатовага тавару—106,5 проц. пляну. У цэнасным выражэньні па чырвонадубнаму цэху плян выкананы на 102 1 проц. Усяго па заводзе—на 98 проц. Гатунковасьць прадукцыі—99,5 проц.

Штодзённага ўліку прадукцыйнасьці працы на заводзе не вядзецца.

АБУТАК.

На абутковай фабрыцы імя Лекерта за 28 студзеня: вінтавым цэхам выпушчана 1850 пар абутку—100 проц. пляну. Першага гатунку—76,8 проц. Рантавым цэхам —888 пар—80,7 проц. выкананьня, першага гатунку—86,5 проц. Па фабрыцы выпушчана 2738 пар абутку, што складае 92,8 проц. пляну. Першага гатунку 79,9 проц.

27 студзеня на фабрыцы быў выходны дзень.

Штодзённага ўліку прадукцыйнасьці працы на фабрыцы не вядзецца.

ГАТОВАЕ АДЗЕНЬНЕ.

Швэйная фабрыка «Прафінтэрн» 28 студзеня выпусьціла паліто дзіцячае 260 і паўпаліто паленшанай якасьці 297 штук, разам—60,6 проц пляну, з іх: бракаваных дзіцячых паліто 20 і паўпаліто паленшанай якасьці—27 (разам 5,1 проц. браку). Паліто дзявочае 520—62,3 проц. пляну, бракаваных паліто 20—2 проц. браку. Паліто хлапчыковае 1083—69,8 проц. пляну, бракаваных 43 паліто—2,8 проц. браку. Па фабрыцы плян выкананы на 62,1 проц., бракаванай прадукцыі 3,6 проц

Штодзённага ўліку прадукцыйнасьці працы на фабрыцы не вядзецца.

ПА ВІНЕ БРЫГАДЗІРА АРЛОВА... (Ліст калгасьніка-ўдарніка).

Брыгадзір Арлоў Яхім (калгас «Чырвоны Кастрычнік», Мікалаеўскага сельсавету) сваёй дзейнасьцю грае на руку клясаваму ворагу. Арлоў сваёй і бацькоўскай каровам скарміў гектар калгаснай сенажаці. На гэта складзены акт, але мер спагнаньня ня прынята. Ён загадаў членам брыгады разасляць лён па мокраму месцу, з-за чаго лён напалову пагніў. Існуе поўная абязьлічка ў карыстаньні цягавай сілай. Каляды Арлоў сьвяткаваў два дні, і ў лес не паслаў ніводнай падводы. Гэты брыгадзір, прыехаўшы з гораду п'яны (што заўсёды з ім бывае), не паставіў каня ў стайню, конь хадзіў усю ноч па двары. Буракі, якія пад адказнасьць Арлова былі захаваны на зіму, памёрзьлі. Падрыхтоўка да веснавога севу не распачата.

Мікалаеўскаму сельсавету і партячэйцы трэба ў адносінах Арлова зрабіць нежэнныя вывады.

БРЫГАДЗІР РАМАНОЎСКІ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЕ.

У калгасе імя Сталіна—Рудніцкага сельсавету, пануе безгаспадарчасьць і кража калгаснай маёмасьці. У брыгадзе Раманоўскага Антона пагніла бульба і турнэпс. З прычыны злачынных адносін да працы брыгадзіра Раманоўскага пакрадзена 10 цэнтн. насеннай бульбы. Абмалочаны авёс быў кінуты брыгадзірам у таку без усялякага нагляду, што дало магчымасьць кулацкім элемэнтам расьцярасьці амаль увесь авёс, які прызначаўся ў насенны фонд.

У брыгадзе № 1 з-за безгаспадарчасьці памёрзла 115 цэнтн. бручкі. Больш двух тыдняў, як тут няма брыгадзіра і ўся маёмасьць без усялякага догляду. Башчанка Яраслай пакраў 6 кілёграмаў ільновалакна. Прайшло больш двух тыдняў, але Башчанка ня прыцягнуты да адказнасьці. Брыгадзіры і праўленьне калгасу да калгаснай маёмасьці адносяцца злачынна, даюць магчымасьць кулацкім элемэнтам раскрадваць маёмасьць, ня прыцягваюць вароў да судовай адказнасьці.

Брыгада «В. П»: Бас, Кляцко.

1-га лютага, у памяшканьні клюбу мэталістаў (Узьбяржная), адбудзецца АГУЛЬНАГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ ВІЦЕБСКУ, прысьвечаны вынікам паходу „За сацуклад у другую пяцігодку“.

У ПАРАДКУ ДНЮ ЗЬЛЁТУ:

1) Даклад аб выніках студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) (дакладчык тав. Міцькоў).

2) Даклады: „Віцебскага пралетара“ і рэдкалегій насьцепазят: „Сьцягавец“ (закройны цэх фабрыкі імя Лекерта), „За шпаркія тэмпы“ (зборачны цэх акулярнай фабрыкі), „Артылерыст“ — шматтыражкі Н-скага артпалку аб выніках паходу „За сацуклад у другую пяцігодку“

3) Урачыстая перадача самалёту „Расселькор-ударнік Віцебшчыны“ школе грамадзянскіх лётнікаў.

4) Прэміяваньне перадавікоў і ўручэньне пераходнага сьцягу імя „Віцебскага пралетара“.

Мастацкая частка.

Уваход па запрашальных білетах, якія разьмяркоўваюцца па прадпрыемствах, установах і вайсковых часьцях.

Пачатак роўна а 6-й гадзіне ўвечары.

Гарадзкі штаб паходу „За сацуклад у другую пяцігодку“.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ

Тэрмін № 12. Друкарня „Камінтэрн“, Замкавая, 16. Тэрмін 8.500 экз.